## Практычныя заданні па тэме “ Лексікалогія”

*Пытанні для самакантролю:*

1. Прадмет і задачы лексікалогіі як раздзела мовазнаўства.
2. Слова і яго значэнні.
3. Адназначныя і мнагазначныя словы; словы з прамым і пераносным значэннем; тыпы пераносных значэнняў слова.
4. Амонімы, паронімы, сінонімы, антонімы і іх тыпы.
5. Лексіка беларускай мовы паводле паходжання.
6. Лексіка беларускай мовы паводле сферы ўжывання.
7. Стылістычныя разрады лексікі.
8. Актыўная і пасіўная лексіка.Устарэлыя словы і неалагізмы.

**1. Прачытайце тэкст. Вызначце лексічнае і граматычнае значэнні падкрэсленых слоў.**

Поўнач была па-зімоваму снежная, сіне-белая і па-вясноваму звонкая, са шкляным лядком пад нагамі. Лейцы календара толькі-толькі перахапіў сакавік, і ўжо іначай, як дагэтуль, па-маладому насцярожана шумеў бор. У зацішку хваёва-ядлоўцавага падлеску, спінаю прываліўшыся да тоўстага дрэва, гледзячы ў сінь блакіту, стаяў Іван Данілавіч – высокі, круглатвары, з прыгожай, коратка падстрыжанай, абсыпанай срэбрам шасцідзесяцігадовага веку барадою і такімі самымі срабрыстымі вусамі. Трапяткая чуйнасць ночы адпавядала настрою душы, і ў гэтай прыемнай згодзе са светам ён трымаў над галавою пыжыкавую шапку, не зводзячы вачэй з чорнай аўтамашыны пад ўрадавым нумарам, якая стаяла за першым ад дарогі шэрагам хвой, пасаджаных пазалетась вясною.

(В.Карамазаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**2. Выпішыце словы, якія ўжываюцца ў пераносным значэнні, і ўкажыце іх значэнне. Вызначце тып пераносу значэнняў слоў.**

Колькі я сцежак перапупаў,
Колькі я прайшоў чужых краін,
Выпрабаваў слодыч і атруту
Казачных і зменлівых мясцін, –
Не прасіла сэрца, не папросіць
Ні раскошы, ні пустых патрэб,
Толькі б на зямлі сваёй штовосень
Славіць свой запрацаваны хлеб.
Трапіўшы на іншую планету,
Я і там ад сэрца запяю
На ўсю шыр бясконцага сусвету
Пра Айчыну светлую сваю.

(Я.Кохан)

**3. Падбярыце антонімы да падкрэсленых слоў, запішыце і абгрунтуйце ваш выбар.**

Сёлетні май быў халодны. У канцы красавіка на збуялую раннюю зелень спачатку пайшлі доўгія золкія дажджы, як увосень; захлюпала на полі ралля. Пасля, тыдні праз два, распагодзілася, завярнула вецер з поўначы, дыхнула сіверам, густым, калючым; па небе пагнала нізкія рудыя рваныя хмары – ударыў зазімак. Чырвоная нітачка на градусніку пад падстрэшкам апусцілася ніжэй за нуль.

Пасля пайшлі крупы, пасыпаліся з цёмных тулягоў, як з рэшата; раставалі на страсе ад скупога сонца, капаючы з доўгіх ценькіх чысценькіх ледзяшоў халоднымі слязьмі; на двары, пазмятаныя ветрам у ямкі, ляжалі цэлы дзень да вечара.

Мерзлі раннія матылькі і пчолы. Асыпаўся ў садах белы цвет – адмёрз.

Да раніцы снег растаў. Упоўдзень аблешчылася неба, зірнула вострае гарачае сонца, заблішчалі мокрыя зялёныя аселіцы і ручаі на вуліцы, якія беглі з фермы, як вясной, размываючы пясчаную дарогу.

(І. Пташнікаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**4. Вызначце даміненты сінанімічных радоў, укажыце семантычныя адценні сінонімаў. Складзіце і запішыце з імі сказы.**

1. Бадзяцца, блудзіць, блукаць, валачыся, сланяцца, сноўдацца, цягацца, швэндацца.

2. Ардынарны, будзённы, звычайны, пасрэдны, радавы.

3. Багата, бездань, безліч, гібель, многа, мноства, нямала, прорва, процьма, шмат.

4. Досвеццем, зацемна, на досвітку, на золку, нацямочку, рана.

**5. Утварыце словазлучэнні, спалучыўшы назоўнікі са словамі. што ў дужках. Растлумачце значэнне ўтвораных словазлучэнняў.**

Корань (бярозы, зуба, слова, зла, жыцця).

Клетка (птушыная, квадратная, грудная).

Кароль (дзяржавы, шахматны, танца).

Нумар (дома, апошні, чаравікоў, эстрадны, у гасцініцы).

**6. Знайдзіце памылкі ўняправільным падборы паронімаў. Запішыце правільныя варыянты.**

1. Маючы абанент на наведаванне басейна ў першым паўгоддзі, мы значна палепшылі свой стан здароўя. 2. Адрасат паслаў пісьмо на адрас, які выклікаў павагу ў жыхароў гэтага горада. 3. Беларускае Палессе вядома ва ўсім свеце сваімі балотнымі тэрыторыямі. 4. Вытворная практыка, якая праходзіць на пятым курсе, найбольш набліжае студэнтаў да адукаванага працэсу сучаснай школы.5. Нарэшце ў выніку шматгадовай партызанскай барацьбы гэта афрыканская маленькая краіна набыла статут незалежнай

дзяржавы. 6. Рэдкія і старажытныя кнігі па абранай тэме можна атрымаць у чытацкай зале.

**7.Падбярыце да іншамоўных слоў беларускамоўныя адпаведнікі і запішыце іх.**

Алегорыя, аргумент, арфаграфія, аўдыенцыя, афарызм, вернісаж, гіпербала, грацыёзны, дыкцыя, дэфект, інтэрвал, інцыдэнт, лозунг, рэзерв, рэзюме, тэрор, уніфікацыя, утрырываць.

**8. Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль. Абгрунтуйце свае меркаванні. Выпішыце дыялектныя назвы і падбярыце да іх адпаведныя літаратурныя. Знайдзіце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Вызначце іх ролю ў тэкстах.**

Сам двор парос травою, пахучымі дробнымі рамонкамі, вясною – залатымі манетамі дзьмухаўцоў. Менавіта на чыстым двары пераважна размяшчаецца «склеп», або (на поўдні) «лёх». (Другі склеп, у якім частка запасаў заўсёды пад рукой, каб не бегаць кожны раз на двор, – у самой хаце ці ў сенцах, пад падлогай). У склепе бульба, гародніна, бочкі з капустай, гуркамі, мочанымі яблыкамі, дзежачка з грыбамі і тоўчанай ягадай, а калі гаспадар рыбак, то, можа, і з салёнай рыбай.

Далей ідзе двор задні, для жывёлы. Яго абкружаюць хлявы, у якіх стаіць жывёла. Тут жа павець, або дрыватня, – крытае памяшканне, з трох бакоў запушчанае сценкамі. Тут складзены дровы, раней стаялі вазы, санкі, плугі…

Замыкаецца двор вялікаю клуняю (свірнам). У стараннага чалавека ёсць яшчэ і капцільня.

Раней пры кожнай хаце на задворках было гумно, а то і два з «еўняю» (сушыльняй) – земляным, гладка ўбітым токам. Адсюль вымалачаны хлеб ішоў у засекі клуні. Гумно было нібы сімвалам гадавой працы селяніна (У. Караткевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**9. Прачытайце тэкст. Знайдзіце словы абмежаванага ўжытку, растлумачце іх значэнне. Вызначце, у якой прафесійнай сферы яны выкарыстоўваюцца.**

Сярод Рагвалодавых унукаў у XII стагоддзі вылучаецца Ефрасіння Полацкая наша першая асветніца.Унучка Усяслава яна пераняла ад дзеда вялікі духоўны запал накіраваны на служэнне свайму народу. Прычыны з якіх Прадслава так звалі Ефрасінню ў мірскім жыцці пайшла ў манастыр застаюцца невядомымі. Магчыма гэта здарылася тады калі бацьку і маці як самых блізкіх людзей вывезлі ў Візантыю. Праўда выпадак як на той час беспрэцэдэнтным не назавеш ігуменняй манастыра дзе прыняла подстрыг Ефрасіння была яе родная цётка. Сям’я у якой Ефрасіння расла глыбокай рэлігійнасцю не вызначалася. Дастаткова прыгадаць што яе бацька больш вядомы сваім язычніцкім імем Святаслаў чым хрысціянскім Георгій. Тое

самае можна сказаць пра Святаслава брата Ефрасінні  які не менш вядомы нам пад язычніцкім найменнем Рагвалод. Не захавалася ў памяці народа хрысціянскае імя самога Усяслава хоць яно безумоўна было  нададзена князю пры хрышчэнні.

(К.Тарасаў)

**10. Адзначце архаізмы.**

Ловы,ураднік, атрамант, батрак, саха, раць, гміна, камбед, дзіда, войт.

**11. Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце стылістычна афарбаваныя словы. Да якога стылю яны адносяцца? З якой мэтай ужывае іх аўтар?**
**Назавіце словы іншамоўнага паходжання. Карыстаючыся «Слоўнікам іншамоўных слоў» А. М. Булыкі, растлумачце іх значэнне і ўжыванне. Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс.**

Пас…род брукаванага рынку ў гэтым п…цьдзесятвулічным заштатным гара…ку стаяў змрочны будынак – два паверхі і вежа. Першы паверх быў схаваны за паўкругам дробных крам, з якіх гандляры, небаракі, прыкаваныя да рысы аседласці, напрамілуй бог заклікалі да сябе людзей. Гармідар у свята ці ў кірмашны дзень быў страшэн…ы. Над ж…лезным крамным дахам узвышаўся верх будынка і вежа, не лішне высокая, але гэткая, якая яна і павінна быць паводле таго, на што яе каліс…ці будавалі: малюсен…кія акенцы, як у астрозе, адно над адным, з якіх і страляць льга і наглядаць, ці далёка ад горада стаў варожы аблог, і верх – готыка. З сярэдн…ве…а захавалася за гэтай будынінай назва – ратуша. Аблупл…ная змураваная цэгла прастаяць можа яшчэ не мала часу.

( Кузьма Чорны)

**12. Прачытайце тэкст. Раскрыйце значэнне запазычаных слоў, калі гэта магчыма, шляхам падбору беларускіх адпаведнікаў. Выпішыце тэрміны, вызначце, як яны ўтварыліся.**

Нашы продкі жылі ў коле часу, інакш кажучы, ён быў у іх не лінейны, а цыклічны, прычым асноўнай адзінкай ліку з’яўляўся, безумоўна, год. Новы год – канец аднаго этапа ў жыцці прыроды і чалавека і пачатак другога, які тым не менш у значнай ступені паўтарае папярэдні. Такі колазварот даваў упэўненасць у трываласці існавання, у бесперапыннасці жыцця.

Год – базавая мадэль для пабудовы ўсёй храналагічнай канструкцыі ў вельмі далёкіх нашых продкаў. Вучоныя знаходзяць яшчэ палеалітычныя календары на касцях мамантаў. У дадзеным выпадку сама прырода (рух Зямлі вакол Сонца) абумовіла дамінантную сутнасць года. Па аналогіі з асноўнымі з’явамі года будаваліся іншыя ярусы эпох, бо кожная падзея ў свеце абавязкова паўтараецца ў перыядах. Нават увесь Космас праходзіць праз такія перыяды – зоны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Год разбіваўся на 12 месяцаў, значыць, па аналогіі і наступны, большы, чым год, перыяд павінен складацца з 12 частак – гадоў, адпаведных месяцам. Пошук аналогій – асноўная асаблівасць першабытнага мыслення, тая яго рыса, якая абумовіла развіццё практычна ўсіх культурных працэсаў.

Існуе іншае – касмічнае – тлумачэнне 12-гадовага цыкла ўсходняга календара. Яно заснавана на суадноснасці руху Сонца і Юпітэра, самай вялікай планеты сонечнай сістэмы. Т. Кудрашова

**13. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце словы, агульныя для рускай і беларускай моў. Складзіце руска-беларускі слоўнік па тэме «Каляндар».**

Слово «календарь» восходит к латинскому «calendae» (первый день месяца), а оно, в свою очередь,– к глаголу «Calare», что означает «выкликать»: в Древнем Риме обязанностью главного жреца было громкое провозглашение первого дня нового месяца.

Вообще же календари создавались независимо от Древнего Рима, задолго до и после него в разных уголках Земли, ибо потребность измерять время возникла у всех народов, как только осознавалась периодичность явлений природы (смена дня и ночи, времени года). Нет нужды доказывать, что упорядоченный счет времени, с одной стороны,– итог длительного развития человеческой мысли, наблюдений и опыта, с другой – необходимое условие дальнейшего развития цивилизации.

Славяне не были исключением. Им тоже пришлось осваивать способы времяисчисления, вырабатывать свой календарь с очень крупными и достаточно мелкими единицами – от понятий «век», «эпоха» до обозначения частей суток (день, ночь, сумерки и пр.).

Исстари основным занятием восточных славян было земледелие, поэтому культура в целом и основная масса праздников, обрядов носила земледельческий характер. Календарь крестьянина представлял собой сложное явление, включающее в себя знание природы, осмысление закономерностей человеческой жизни, сельскохозяйственный опыт, обряды, произведения устного народного творчества, установившиеся веками нормы общественной жизни и многое другое. Это своеобразный дневник и энциклопедия крестьянского быта с его праздниками и буднями А. Ф. Некрылова

**14. Запішыце 10 педагагічных і 10 псіхалагічных тэрмінаў спачатку на рускай, затым на беларускай мовах. Дайце азначэнні гэтым тэрмінам.**

**15.** Прапануюцца практыкаванні і заданні з выдання: Грыгор’ева, Л.М. Сучасная беларуская мова. Зборнік практыкаванняў : вучэб. дапаможнік / Л.М.Грыгор’ева, Г.Ф.Андарала. – Мінск: Выш. шк., 2010. – С. 47 – 72.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ